УДК 7.046.3

Уладзімір Карэлін, Мікалай Мельнікаў

# Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі

**Володимир Карелін, Микола Мельников**

**Рідкісні сюжети в іконопису Білорусі**

Розглянуто деякі іконографічні сюжети, що досить рідко трапляються у храмах Білорусі – не більше ніж у трьох випадках. Наведено короткі відомості про зображених святих, розглянуто іконографію окремих творів.

*Ключові слова*: образ, святі мученики, іконографія, атрибути

**Vladimir Karelin, Nikolaj Melnikov**

**Rare plots in the icon-painting of Belarus**

Some rare iconographic plots, which have appeared no more than three times in Belorussian churches, are analyzed. Brief descriptions of the depicted saints and the iconography of certain works are considered.

*Keywords:* icon, the Martyr Saints, iconography, attributes

У дадзеным паведамленні, як і ў папярэдніх [1, с. 335; 2, с. 486], разглядаюцца асаблівасці іканаграфіі асобных, рэдка сустракаемых на Беларусі абразоў, прыводзяцца іх тэхнічныя дадзеныя і падаюцца кароткія звесткі аб персанажах, згодна літаратурных крыніц [3, 4, 5]. Дні шанавання святых прыводзяцца па грыгарыянскаму і юліянскаму календарах.

Вялікапакутніца Ірына (у міру Пенелопа; памерла ў канцы I – пачатку II ст.), згодна жыція, была дачкой Ліцынія, правіцеля вобласці Мігдонія, што ў Македоніі. У 12-гадовым узросце яна прыняла хрост ад вучня ап. Паўла Цімафея. За свае выказванні і прапаведванне хрысціянства святая пацярпела шмат жорскіх пакутаў, аднак, па Божай міласці, заўсёды заставалася жывой і цэласнай. Праз чатыры дні пасля Божага паведамлення аб надыходзячай канчыне, Ірына была прызвана Хрыстом на неба, паколькі яе труна ў скале, закрытая камнем, аказалася пустой. Памяць вялікапакутніцы адмячаецца 18 (5) траўня.

На абразах св. Ірына звычайна падаецца з крыжам у руцэ, у царскім аблачэнні і ў кароне. Аднак толькі на адным з чатырох зафіксаваных на Беларусі абразоў *(іл. 1)*, дзе святая прадстаўлена разам з вялікапакутнікам Феадорам Страцілатам, яе аблачэнне падобна да царскага. Адметнай

дэталлю з'яўляецца тое, што рукі з малітоўнымі чоткамі скрыжаваны на грудзях. На галаве, павязанай белым платам, знаходзіцца вянец. На астатніх абразах святая апранута ў простую сукенку з накінутым паверх плашчом. У руках яна трымае крыж, на галаве – вянец.

Святы пакутнік Каллінік (III-IV ст.), згодна жыція, паходзіў з Кілікіі (М. Азія) і з дзяцінства быў выхаваны ў хрысціянскай веры. За прапаведванне вучэння Ісуса Хрыста прыняў жорсткія пакуты і быў спалены на вогнішчы. Яго памяць шануецца 11 жніўня (29 ліпеня).



*Іл. 1. Св. вялікапакутнікі Ірына і Феадор Страцілат. Добруш Гомельскай вобл. Другая палова XIX ст. Дошка, алей, 130×80*



*Іл. 2. Св. пакутнік Каллінік. Бярозаўскі раён Брэсцкай вобл. Другая палова XIX ст. Палатно, алей, 36×60*

На адзіным абразе з Брэсцкай вобл. св. Каллінік прадстаўлены ў паяснoй выяве разам з апосталам Андрэем Першазваным *(іл. 2)*. Святы пакутнік абодвума рукамі прыціскае да грудзей крыж, яго позірк скіраваны ўверх.

Св. пакутніца Людміла, княгіня Чэшская (каля 860 – 15 верасня 921) была жонкай першага хрысціянскага князя Чэхіі Боржывоя I (абодва яны прынялі хрост ад роўнаапостальнага Мефодзія) і рэгентам свайго ўнука – князя Вацлава Святога, якога яна выхоўвала ў духу хрысціянства. Была задушана паганскай шляхтай ў ноч з 15 на 16 верасня 921 г. Верагодна, у якасці прылады згубы быў скарыстаны галаўны покрыў княгіні, які потым стаў яе сімвалам. У 1143–1144 гг. Людміла была далучана да ліку святых. Яна лічыцца святой апякункай Чэхіі, а таксама апякункай бабуль, матуль і хрысціянскіх настаўнікаў. Дзень яе шанавання 29 (16) верасня.

На адзіным абразе з г. Брэста *(іл. 3)* прадстаўлена велічная постаць св. пакутніцы ў багатым аблачэнні. Яна стаіць на беразе ручая з мосцікам, на фоне гарадской забудовы з вялікай колькасцю храмаў. У левай руцэ св. Людміла трымае пальмавую сцябліну, у правай – крыж з рас-



*Іл. 3. Св. пакутніца Людміла. Брэст. XIX ст. Дошка, алей, 71×53*



Іл. 4. Св. пакутнік Максімільян. Слонімскі раён Гродзенскай вобл. Пач. 20 ст. Палатно, алей, 134×64

пяццем. Яе погляд скіраваны ў левы верхні кут абраза, дзе на воблаках змешчана выява бласлаўляючага Хрыста. Над галавой пакутніцы, пакрытай платам, знаходзіцца авальны німб з прамянямі і надпісам: «с: мч людмилла:».

Святы пакутнік Максімільян – адзін з сямі эфескіх юнакоў, якія ў III ст., падчас праўлення імператара Дэкія, за сваю хрысціянскую веру былі зажыва замураваны ў пячоры. Аднак, па волі Божай, яны не загінулі, а заснулі і прачнуліся толькі праз два стагоддзі, калі іх выпадкова знайшлі ў той жа пячоры. Праз гэты цуд Гасподзь раскрыў таямніцу будучага ўваскрэсення памерлых і іх жыцця. Эфескія пакутнікі шануюцца ў хрысціянстве і ісламе. У праваслаўнай царкве іх памяць адмячаецца 17 (4) жніўня і 4 лістапада (22 кастрычніка), у каталіцкай царкве – 27 чэрвеня.

На абразе з Гродзенскай вобл. *(іл. 4)* прадстаўлена роставая выява св. Максімільяна ў выглядзе юнака ў багатым аблачэнні. Яго правая рука прыціснута да грудзей, у левай знаходзіцца хлеб, які эфескія пакутнікі куплялі ў горадзе падчас свайго знаходжання ў пячоры. У верхняй частцы абраза змешчаны надпіс: «Св. Максимилианъ отр. Ефесс».

У адным з храмаў г. Слоніма Гродзенскай вобл. знаходзіцца абраз свяціцеля Марціна Іспаведніка *(іл. 5)*, папы Рымскага (5.07.649–16.09.655). За тое, што Марцін на Латэранскім саборы насуперак указу імператара Канстанта II асудзіў монафелітаў як ерэтыкоў, ён пасля працяглых здзекаў быў высланы ў Херсанес Таўрычаскі, дзе і памёр 16 верасня 655 г. Яго памяць шануецца каталіцкай царквой 13 красавіка, праваслаўнай царквой – 27 (14) красавіка.





*Іл. 5. Свяціцель Марцін Іспаведнік, папа Рымскі. Слонім Гродзенскай вобл. Другая палова XIX ст. Палатно, алей, 48×33*

На абразе авальнай формы прадстаўлена паясная выява свяціцеля Марціна з сівымі барадой і вусамі і непакрытай галавой. У левай руцэ ён трымае скрутак, а правую прыціскае да грудзей. З абодвух бакоў выявы змешчаны надпіс: «С. Мартинъ папа Римск.».

Святая Макрына (Макрына Малодшая; 327 ці 330–380) нарадзілася ў Кападокіі (сучасная Турцыя), у арыстакратычнай хрысціянскай сям'і. Яе малодшымі братамі былі свяціцелі Васіль Вялікі і Рыгор Ніскі. Маці дала ёй імя Фёкла, аднак радня стала зваць Макрынай у гонар бабулі-хрысціянкі. Пасля смерці жаніха Макрына стала манашкай, яна валодала дарам сцалення і нейкі час кіравала абіцеллю. Памерла св. Макрына ў 380 г. Яе память адмячаецца Праваслаўнай царквой 1 жніўня (19 ліпеня), Каталіцкай царквой – 19 ліпеня. На Русі існавала павер'е, што з гэтага дня пачынае пацїху прыходзіць восень. Таксама, ад наяўнасці ці адсутнасці ў гэты дзень дажджу, вырашалі, якая будзе восень – мокрая ці сухая.

Адзіны абраз з выявай св. Макрыны *(іл. 6)* знаходзіцца ў Камянецкім раёне Брэсцкай вобл. Франтальныя постаці святой разам з яе братам, свяціцелем Васілём Вялікім, прадстаўлены на фоне чырвонай паласы заходу і блакітнага неба. У гэтай чырвона-блакітнай гаме вырашаны



*Іл. 6. Св. Макрына і сваціцель Васіль Вялікі.*
*Камянецкі раён Брэсцкай вобл. VIII ст. Палатно, алей, 146×100*

як колер аблачэння асноўных персанажаў, так і колер верхняй часткі кампазіцыі, дзе на чырвона-карычневых аблоках прадстаўлена выява Маці Божай Жыровіцкай у чырвонай сукенцы і сінім мафорыі.

Святыя пакутнікі Назарый (жыў у Рыме ў перыяд праўлення імператара Нерона, паміж 54 і 68 гадамі) і Іуліанія Нікамідзійская (прыняла смерць недзе ў 304-305 г.) пацярпелі за прапаведванне хрысціянства і за сваю стойкасць у Хрыстовай веры. Пасля шматлікіх жорсткіх пакут яны абодва былі асуджаны на адсячэнне галавы мячом. Дні памяці св. Назарыя – 27 (14) кастрычніка ў Праваслаўнай царкве і 28 ліпеня ў Каталіцкай царкве; св. Іуліаніі – 3 студзеня (21 снежня) ў Праваслаўнай царкве і 16 лютага ў Каталіцкай царкве.

Кампазіцыя абраза з гэтымі святымі, які знаходзіцца ў адным з храмаў г. Магілёва *(іл. 7)*, носіць сіметрычны характар. Роставыя выявы пакутнікаў на фоне гарыстага пейзажу знаходзяцца з абодвух бакоў абраза і крыху павернуты адзін да аднаго. Кожны трымае ў апушчанай руцэ – Назарый у правай, Іуліанія ў левай – крыж і пальмавую сцябліну. У цэнтры верхняй часткі абраза, сярод аблокаў, змешчаны трохкутны німб (сімвал Саваофа) у прамяністым ззянні і з выявай св. Духа ў выглядзе галуба ў сярэдзіне. З абодвух бакоў, па вуглах, лунаюць галоўкі херувімаў. Ззянне вакол трохкутнага німба, як і німбы вакол галоў пакутнікаў, выкананы ў тэхніцы разьбы па ляўкасу. Асноўная колеравая гама абраза – блакітна-чырвоная. На св. Іуліаніі паверх сіняй сукенкі і белага далматыка апранута залатая кіраса – сімвал яе стойкасці і мужнасці. На зваротным баку абраза змешчаны надпіс: «Сей образъ надал В церковъ николаивскую госпажи фартальной ульяны игоривны фамилія залагина до жена таранова заотпущенія греховъ ~ 1823 го Года Мъсица Гънваря».

У вобразе святога пакутніка Нікіты яшчэ ў эпоху сярэдневечча аб'ядналіся ўяўленні аб Нікіце Готскім, вайскоўцы-хрысціяніну, які пацярпеў за веру ад цара готаў Афанарыха (каля 372 г.), і аб Нікіце, які пабівае беса, – раннехрысціянскім пакутніку, пацярпеўшым за Хрыста ў Канстанцінопалі. Гэтаму паспрыяла і тое, што памяць абодвух пакутнікаў святкавалася ў адзін дзень – 28 (15) верасня. Згодна апокрыфа, Нікіта Бесагон (як яго празвалі ў народзе) быў кінуты ў цямніцу за спробу звярнуць у хрысціянскую веру свайго бацьку рымскага імператара-паганца Максіміяна. У цямніцы яму з'явіўся бес у вобразе анёла і стаў спаку-



*Іл. 7. Св. пакутнікі Назарый і Іуліанія Нікамідзійская.*
*Магілёў. 1823 г. Дошка, тэмпера, 95×75*

шаць адрачыся ад Хрыста. Аднак Нікіта з дапамогай малітвы распазнаў д’ябла, прыдушыў таго і пабіў сваімі кандаламі. Сцэна пабівання была папулярнай на Русі і адлюстроўваецца на большай частцы абразоў, прысвечаных Нікіце Бесагону.




*Іл. 8. Св. пакутнік Нікіта Бесагон. Глыбоцкі раён Віцебскай вобл. Пач. XIX ст. Дошка, алей, 40×29*

На двух абразах, выкананых ў інсітным стылі, што зафіксаваны ва ўсходніх рэгіёнах Беларусі, замест сцэны пабівання прадстаўлена даволі статычная кампазіцыя, дзе св. Нікіта ў воінскіх даспехах і доўгім чырвоным плашчы трымае павержанага д’ябла на ланцугу. На абразе з Віцебскай вобл. *(іл. 8)* ён левай нагой прыціскае д’ябла да зямлі, а ў прыўзнятай правай руцэ трымае крыж. На другім абразе з Гомельскай вобл. (XIX ст., дошка, алей, 70×55) у верхнім левым вуглу, на аблоках, знаходзіцца выява бласлаўляючага Хрыста, на якога пакутнік Нікіта паказвае прыўзнятай правай рукой.

Прэпадобны Ніл Сталобенскі (канец XV ст., – 7 снежня 1555 г.) з’яўляецца святым Рускай праваслаўнай царквы і заснавальнікам Ніла-Сталобенскай пустыні. Ён нарадзіўся на Наўгародскай зямлі, а пасля смерці бацькоў, яшчэ юнаком, прыняў манаскі пострыг з імем Ніл у Крыпецкім манастыры. У 1515 г. вырашыў стаць пустэльнікам і пабудаваў сабе келлю ў лесе, каля рэчкі Чарэмхі, дзе пражыў 13 гадоў. Калі звесткі пра яго дайшлі да людзей, Ніл у 1528 г. перасяліўся на востраў Сталобны на возеры Селігер, дзе збудаваў драўляную келлю і часоўню. Там ён пражыў 27 гадоў да самай смерці ў адзіноце і аскетызме,



*Іл. 9. Прэпадобны Ніл Сталобенскі.*
*Івацэвіцкі раён Брэсцкай вобл. XIX ст. Дошка, алей, 31×24*

з мужнасцю пераносячы ўсе нязгоды і нападкі злодзеяў. Пасля канчыны прэпадобнага Ніла, бліз яго магілы сталі сяліцца пустэльнікі-малітоўцы, якія і заснавалі манастыр. Памяць святога шануецца 20 (7) снежня і 9 чэрвеня (27 траўня).

На большай частцы абразоў з выявай прэпадобнага Ніла, зафіксаваных у храмах Беларусі, ён традыцыйна прадстаўлены ў роставай выяве, ў манаскім аблачэнні на фоне Ніла-Сталобенскай пустыні, як на абразе з Брэсцкай вобл. *(іл. 9)*. Яго погляд скіраваны ўверх, на выяву абраза Маці Божай Уладзімірскай.

Амаль усе прадстаўленыя выявы святых пакутнікаў адпавядаюць іканаграфічнаму канону – гэта франтальныя роставыя ці паясныя адлюстраванні. У руках яны трымаюць сімвалы пакутніцтва – крыжы ці пальмавыя сцябліны, радзей могуць прысутнічаць скруткі з надпісамі, кнігі і малітоўныя чоткі. Кампазіцыя абраза ў яго верхняй частцы можа быць дапоўнена выявай бласлаўляючага Хрыста на аблоках, выявай Маці Божай, ці, нават, трохкутным німбам Саваофа, а таксама архітэктурнымі элементамі.

1. Карэлін У. Р. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі / У. Р. Карэлін, М. П. Мельнікаў // Історія релігій в Україні : наук. щорічник. — Львів, 2015. — Кн. 2. — С. 335–350.
2. Карэлін У. Р. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі / У. Р. Карэлін, М. П. Мельнікаў // Історія релігій в Україні : наук. щорічник. — Львів, 2016. — Ч. 2, 3. — С. 486–497.
3. Православная энциклопедия [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.pravenc.ru.
4. Католическая энциклопедия.— М. : Изд-во Францисканцев, 2002. — Т. 1. — 1906 с.
5. Католическая энциклопедия.— М. : Изд-во Францисканцев, 2005. —Т. 2. — 1818 с.
6. Католическая энциклопедия.— М. : Изд-во Францисканцев, 2007. — Т. 3. — 1910 с.